# Назоўнік: род, лік, склон (паўтарэнне)

Урок беларускай мовы ў 5 класе

**С. М. Патапчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 3 г. Пінска

**Мэты**:

– паўтарэнне і замацаванне ведаў, атрыманых у пачатковых класах, пра назоўнік;

– актуалізацыя ведаў пра пачатковую форму назоўніка;

– знаёмства з паняццем пра назоўнікі, якія ўжываюцца ў форме адзіночнага ці толькі ў форме множнага ліку;

– удасканаленне ўменняў вызначаць назоўнікі ў тэксце, групаваць па сэнсавых, граматычных прыметах, правільна ставіць да назоўнікаў склонавыя пытанні, вызначаць род, лік, склон, спалучаць назоўнікі з іншымі часцінамі мовы;

– выхаванне пачуцця грамадзянскасці і патрыятызму.

**Абсталяванне:** карткі з заданнямі, карта Беларусі.

## ХОД УРОКА

### I. Арганізацыйны момант

Добры дзень, дзеці! Пачынаць любую справу патрэбна з добрага настрою. Створым добры, дружалюбны настрой. Усміхніцеся адзін аднаму. Сядайце!

### II. Праверка дамашняга задання

Праверым дамашняе заданне і паглядзім, ці ўсе зразумелі тэму на мінулым уроку. А можа, у каго ўзніклі пытанні? (праверка правільнасці выканання пр. 35)

### III. Падагульненне вывучанага матэрыяла

Вам патрэбна разгадаць крыжаванку.



Па гарызанталі:

1. Якой формай маўлення вы карыстаецеся, калі адказваеце на пытанне настаўніка? (вусная)

2. Колькі патрэбна людзей, каб адбыліся маўленчыя зносіны? (многа)

3. Як называецца водступ управа ў пачатку радка з мэтай аддзялення адной часткі тэксту ад другой? (абзац)

4. Якой формай маўлення вы карыстаецеся, калі выконваеце дамашняе заданне, спісваючы тэкст з падручніка? (пісьмовая)

5. Адзін з элементаў інтанацыі, большы ці меншы па працягласці прыпынак голасу ў час чытання літаратурнага твора. (паўза)

6. Як называецца стыль, які выкарыстоўваецца ў слоўніках, даведніках, энцыклапедыях? (навуковы)

7. Як называецца стыль, які выкарыстоўваецца ў творах мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці? (мастацкі)

8. Як называецца стыль, які выкарыстоўваецца падчас гутаркі ў неафіцыйных абставінах? (гутарковы)

Па вертыкалі:

9. Ключавое слова (назоўнік)

**IV. Паведамленне тэмы і мэтавызначэнне**

Па ключавым слове нашай крыжаванкі вызначце тэму ўрока. (Вучні вызначаюць тэму і мэты ўрока. Тэму ўрока запісваюць у сшыткі.)

**V. Актуалізацыя ведаў па тэме**

Якія часціны мовы вывучалі ў пачатковых класах?

Прывядзіце прыклады назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, займеннікаў.

Дапоўніце звесткі пра часціны мовы ў пр. 36 (вусна)

**VI. Замацаванне**

а) Практыкаванне 38 (3 вучні працуюць ля дошкі, астатнія ў сшытках): устаўце прапушчаныя літары, растлумачыць іх правапіс, вызначыць часціны мовы.

Праверце, ці правільна запісаны словы на дошцы. Ці ёсць памылкі?

б) Хто ведае, якая форма лічыцца для назоўніка пачатковай? (прачытайце правіла на с. 24)

Назавіце склоны назоўнікаў. Як правільна вызначыць склон назоўніка?

Зараз запішыце сказ, выпішыце назоўнікі і пастаўце іх у пачатковую форму, вызначце род, лік, склон (1 вучань запісвае на дошцы).

*Ляцяць вятры з далёкага поўдня і нясуць з сабой веснавую сілу.*

**(**вятры – вецер (мн.л., н.скл.,м.р.), поўдня – поўдзень (адз.л., р.скл., м.р.), сілу – сіла **(**адз.л., в.скл., ж.р.)

в) самастойная работа (пр. 39)

Прачытайце верш.

Чаму верш мае такую назву?

Звярніце ўвагу на карту Беларусі (карта прымацавана на дошцы). Калі правесці межы нашай краіны, на што яна падобна?

Як вы разумееце словы “Названа светла: Беларусь”?

З чым параўноўваецца наша краіна? Зачытайце гэтыя словы.

Да каго звяртаецца паэт у вершы? З якой мэтай?

Выпішыце выдзеленыя словы і пастаўце іх ў пачатковую форму

**Фізкультмінутка**

Праверка выканання пр. 39.

г) Работа з тэкстам (на картках)

*Звіняць ручайкі ў вячэрняй цішыні.Кажуць, гэта в_сна бразгае срэбранымі ключамі, адмыкаючы дзверы в_трам. Зіма адступае ў невядомыя паўн_чныя далі, а наўздагон ёй імчыцца в_сёлая пераклічка птушак, звон ручайкоў. Цудоўны мой край!*

Заданні да тэксту:

1. Спішыце. Падкрэсліце назоўнікі.
2. Вызначце іх род, лік, склон.

Праверка выканання задання.

**VII. Падвядзенне вынікаў**

Што абазначае назоўнік?

На якія пытанні ён адказвае?

Якая форма назоўніка называецца пачатковай?

Якога роду бывае назоўнік?
Пералічыце склоны, па якіх змяняецца назоўнік?

**VIII. Дамашняе заданне**
П. 5, пр. 41.

**IX. Рэфлексія “Светлафор”**
Ацаніце сваю работу на ўроку пры дапамозе сігнальных картак светлафора: зялёны – усё зразумела, жоўты – ёсць цяжкасці, чырвоны – шмат невядомага.